# «...Ногі просяцца скакаць»

**Завадатары вяселля, пазыўныя танцаў, адвечныя спадарожнікі музыкаў — цымбалы і гармонік. Яны заўсёды ў цэнтры свята. Рэй вялі і на гала-канцэрце ў Белдзяржфілармоніі з нагоды 25-годдзя міжнароднага фестывалю народнай музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік».**

Толькі крані струны... І нібы трапляеш у акіян гармоніі. Хвалі то накотваюць, то адступаюць. Здаецца, немагчыма іх утаймаваць. Вытанчанае чарадзейства цымбалаў. Пэўна, музыкантам з Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра Рэспублікі Беларусь імя І. Жыновіча (кіраўнік — народны артыст Беларусі, прафесар Міхаіл Казінец) вядомы нейкі сакрэт. Зноў і зноў б'ючы па струнах, яны спачатку прылашчвалі хвалі, а потым ускалыхвалі. Музыка лілася то лагодна, то напорам. Непараўнана прагучала ў выкананні аркестра фантазія А. Крамко на тэмы беларускіх народных песень у апрацоўцы У. Мулявіна, задаўшы тон канцэртнай праграме. Хацелася стаіцца, на адным дыханні ўспрымаць чароўную рамантыку і плыць па хвалях гармоніі.

Зладжана разам з аркестрам выступіла цымбалістка з Пастаў Аляксандра Барысюк. Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь «Паазер'е» прадставіў дыятанічныя цымбалы, якімі славіцца Пастаўская зямля (гэты ўнікальны від цымбалаў захаваўся з часоў груздаўскіх музыкаў).

«Як гармоніка пайшоў перабор, весялілася і хата, і двор», — тонкі голас



*Скокі ад фальклорнага ансамбля «Крупіцкія музыкі».*

душы быў адчувальны ў выступленні заслужанага калектыву «Спадчына» (г. Дзяржынск). Лье гармонік-весялун — жыве беларуская песня. З першых нот скарыў гарманіст з Вілейскага раёна Барыс Харэвіч: клавішы ахвотна адгукаліся залівістай мелодыяй.

Вылучыўся ансамбль народнай музыкі «Мінскія музыкі». «Пад гармонікаў лады забывайце пра гады», — заклікаў гарманіст «Мінскіх музыкаў», двойчы дыпламант конкурсу «Іграй, гармонік» Вячаслаў Бацечка. У калектыве ён ужо амаль 20 гадоў. Гармонік любіць за тое, што заўсёды пры сабе, а таксама за прастату: «Два рады, не трэба многа «гузікаў», а музыка вельмі цёплая, задорная. Калі чуецца гармонік у вёсцы з аднаго краю, бягуць з усіх бакоў». Любоў да музыкі ў Вячаслава Вікенцьевіча ад маці; прыкладам служылі і знакамітыя сваякі: «Мае тры дзядзькі, браты маці, — вядомыя пашкоўскія музыкі Трыбухоўскія (з вёскі Пашкоўцы каля Ляхавіч), якія ігралі ў пана Пілсудскага на дажынках. У вёсцы ў нас было 11 скрыпачоў, толькі ўявіце — і гэта ў 20-я гады...» У такіх самародкаў, як Вячаслаў Бацечка, кажуць, іграе душа.

«Як цымбалы зазвіняць, ногі просяцца скакаць!» (В. Бацечка). Гарэзлівае танцавальнае прадстаўленне падарыў заслужаны калектыў «Палешукі» (г. Іванава Брэсцкай вобласці). На біс танчыў фальклорны ансамбль «Крупіцкія музыкі»: харэаграфічная замалёўка «Боб малачу» прыйшлася гледачам вельмі даспадобы. Настрой стварылі ўдзельнікі ансамбля старадаўняй музыкі «Пастараль», капэла народных духавых інструментаў «Гуды» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Як заўсёды ярка выглядаў дзіцячы фальклорны ансамбль «Дударыкі». Цешылі юны гарманіст Антон Лукашэвіч з Мінска, Васіль Шпігановіч з Дзятлава, Любоў Галубіцкая з Чачэрска.

Як гімн прагучала на завяршэнне ў выкананні «Мінскіх музыкаў»: «Гармонік грае, / Ля сябе народ збірае. / Хай пяе і весяліцца / Беларуская сталіца!»

Фестываль «Звіняць цымбалы і гармонік» стаў сімвалам беларускай народнай песні, падмуркам народных музычных традыцый. З году ў год ён яднае на Пастаўскай зямлі прыхільнікаў самабытнага мастацтва, адкрываючы новыя таленты.

— Гэтым канцэртам нам хацелася даць магчымасць слухачам яшчэ раз наблізіцца да крыніц і вытокаў народнага мастацтва, — адзначыў аўтар праекта і сцэнарыя канцэрта, намеснік старшыні Беларускага фонду культуры Тадэуш Стружэцкі. — А таксама паказаць, наколькі багатая наша музычная спадчына.

**Наталля СВЯТЛОВА**



Фота Яўгена Пясецкага.

*Выступае ансамбль народнай музыкі «Паазер'е».*

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ